Беняконі

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
09.08.2015 01:00



Дэканат Радунь Вёска вядома з XVII ст., калі яна належала роду Чаплінскіх. Касцёл пад тытулам св. Яна Хрысціцеля быў заснаваны тут па фундацыі тагачаснага ўладальніка вёскі графа Яна Сымонавіча Чаплінскага ад 16 жніўня 1634 г. і пабудаваны з дрэва. Адначасова з касцёлам граф перадаў касцёлу фальварак Хадкішкі і в. Перагані для ўтрымання там шпіталя на 16 чалавек, а ў 1638 г. зафундаваў яшчэ і парафіяльны шпіталь.

У 1737 г. быў скончаны касцёл, які будаваў тагачасны плябан кс. Леон Мінкоўскі, а пасля яго смерці – кс. Ян Кант-Шабікоўскі. Прэзбітэрый касцёла быў мураваны, з дзвюма сакрыстыямі, а малітоўная зала – драўляная. Скатны гонтавы дах пасярэдзіне ўвенчвала вялікая вежа-сігнатура. Пры гэтым касцёл узгадваецца пад тытулам св. Юрыя.

Інтэр’ер касцёла ўпрыгожвалі 4 алтары. Галоўны алтар быў створаны па фундацыі Яна Шрэтара, кашталяна інфляндскага, у 1765 г. і кансэкраваны 13 сакавіка 1687 г. Уладзіславам Сільніцкім, біскупам-суфраганам віленскім. У цэнтры алтара быў змешчаны тытульны абраз св. Яна Хрысціцеля, а ў другім ярусе – абраз “Укрыжаванне”. Левы бакавы алтар, устаноўлены ў 1742 г., быў прысвечаны св. Лаўрэнцію, правы ж, датаваны 1762 г., – Маці Божай Троцкай, абраз якой быў каранаваны. Чацвёрты алтар меў абраз святога Шкаплера. У арцы прэзбітэрыя быў выкарыстаны характэрны рэнесансны прыём – гарызантальная бэлька-зацяжка з Укрыжаваннем пасярэдзіне, таму магчыма, што мураваны прэзбітэрый – гэта і быў першапачатковы касцёл. Апошні драўляны касцёл быў вытрыманы ў традыцыях народнага дойлідства з рысамі барока. Трохнававая святыня мела прамавугольны выцягнуты план, галоўны фасад быў вырашаны як шасцікалонны порцік пад крывалінейным барокавым франтонам, завершаны глухой чацверыковай вежай пад чатырохсхільным дахам з карункавым крыжам. † Да 1808 г. да

беняконскай парафіі належала капліца ў Канвелішках, пакуль там не ўтварылася самастойная парафія. У XIX ст. як прыпісная ўзгадваецца і філія ў Бутрыманцах (сёння парафія ў Літве), а колькасць парафіян складала амаль 5000 вернікаў.

На пачатку XX ст. у Беняконях вырашылі пабудаваць новы, ужо каменны, велічны касцёл. Святыню пачалі ўзво-дзіць у 1900 г. на гістарычным месцы па ініцыятыве і дзякуючы намаганням ксяндза пробашча Тадэвуша Загорскага, аб чым напісана на мемарыяльнай дошцы ў касцёле. Будаўніцтва скончылася ў 1902 г. Аб гэтым сведчыць пліта з датай MCMII, усталяваная на апсідзе храма. Святыня ўяўляе сабою дзвюхвежавую трохнававую базіліку з трансептам у эклектычным стылі з рысамі неабарока і неакласіцызму. Апсіда паўкруглая, фланкаваная дзвюма сакрыстыямі, якія злучаюцца аб'ёмам, што агінае па перыметры паўкруг апсіды. Галоўны фасад, завершаны трохвугольным франтонам, фланкаваны трох'яруснымі магутнымі чацверыковымі вежамі-званіцамі пад фігурнымі неабарокавымі купаламі са спічакамі. Цэнтральная нава і трансепт накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі двухсхільнымі бляшанымі дахамі з трохвугольнымі франтонамі на тарцах і конусападобнай формай над алтаром.

Навы касцёла перакрыты крыжастымі скляпеннямі на падпружных арках. Выкарыстаны цікавы прыём асвятлення верхняга яруса галоўнага алтара шэрагам круглых вокнаў-люнетаў у конхавым скляпенні. Інтэр'ер упрыгожваюць тры двух'ярусныя алтары: галоўны прысвечаны патрону касцёла св. Яну Хрысціцелю, левы – Божай міласэрнасці (у другім ярусе знаходзіцца абраз Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса), правы – Маці Божай Шкаплернай.

Беняконі

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
09.08.2015 01:00

